# АКТУАЛЬНАСЦЬ ВЫВУЧЭННЯ ТВОРАЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРЫ

***Кудзін М. А.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– В. П. Шаўчэнка, ст. выкладчык*

Васіль Быкаў па праву лічыцца выдатным беларукім пісьменнікам. А шлях да гэтага прызнання быў нялёгкім. У абдымках лёсу пісьменніку ніколі не было ўтульна. Пераадолець цяжкасці, якія чыніліся савецкай ідэалагічнай сістэмай, вытрымаць знішчальную крытыку і прайсці выпрабаванне сумленнем было дадзена не кожнаму. “Васіль Быкаў заўсёды заставаўся верным праўдзе жыцця, рашуча не прымаў аніякіх масак, за якімі іншыя спрабавалі схаваць сваё сапраўднае аблічча” [1, с. 90]. Як вядома, асноўная тэма творчасці Васіля Быкава – вайна, якую ён ведае з уласнага вопыту. Пісьменнік паказвае ваенныя падзеі з суровым, жорсткім рэалізмам, стварае вострыя маральныя канфлікты, экстрэмальныя сітуацыі, у якіх праяўляецца чалавечы патэнцыял асобы, яе псіхалогія і ўнутранае аблічча. “В. Быкаў не проста раскрывае пачварнае аблічча вайны, пратэстуе супраць яе, а на вядомым матэрыяле ўзнімае агульначалавечыя праблемы жыцця і смерці, любові і нянавісці” [2, с. 219]. Тэма чалавечнасці, мужнасці, вернасці самому сабе, адказнасці перад іншымі, жорсткасці, нялюдскасці – асноўныя ў яго творчасці. Калі гаварыць пра вывучэнне творчасці В. Быкава ў школе, то трэба адзначыць, што ўпершыню вучні сустракаюцца з творамі гэтага пісьменніка яшчэ ў 5–7 класах. Менавіта на гэтым этапе трэба засяродзіць увагу вучняў на тым, што тэма вайны – галоўная ў творчасці Быкава. Вельмі важна, каб вучні пераканаліся і ў тым, што часцей за ўсё пісьменнік паказвае ў сваіх творах лёсы звычайных людзей, якія на вайне здзяйсняюць геройскія ўчынкі, сумленна выконваюць свой салдацкі абавязак. У творах В. Быкава ніколі не было галоўнакамандуючых, толькі простыя людзі, якія ў жорсткіх умовах трапляюць у такія сітуацыі, калі неабходна рабіць выбар паміж дадатным і адмоўным.

Такім чынам, актуальнасць вывучэння твораў В. Быкава на ўроках літаратуры ў тым, што школьнікі далучаюцца да багацця беларускай і сусветнай мастацкай літаратуры, эстэтычна спасцігаюць свет, складанасці чалавечых узаемаадносін і на гэтай аснове “выхоўваецца асоба з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, адданасцю агульначалавечым ідэалам” [3, с. 12].

МГПУ им. И.П.Шамякина

**Літаратура**

1. Афанасьеў, І. Будзем садзіць сад: літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск, 1994. – С. 87 – 92.

2. Бугаёў, Д. Я. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе: дапам. для настаўнікаў установ, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі / Д. Я. Бугаёў, М. І. Верціхоўская, В. У. Верціхоўская. – Мінск: Аверсэв, 2005. – С. 209 – 226.

3. Барысевіч, Н. І. Асаблівасці вывучэння творчасці Васіля Быкава ў школе // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 2008, – №7. – С. 12–19.



МГПУ им. И.П.Шамякина